# ПАЛАЮЧЫЯ БЕРАГІ

## З якімі цяжкасцямі сутыкнуліся савецкія войскі пры ўзяцці Слаўгарада

**1 кастрычніка 1943 года войскі 3-й і 50-й савецкіх армій увайшлі ў Прапойскі раён і на працягу двух дзён ачысцілі ад немцаў левабярэжныя часткі рэк Сож і Проня — вёскі Старынку, Сычын, Дабранку, Каменку, Кліны, Казакоўку, Благадаць, Гіжэнку, Целяшы, Бярозаўку, Ляцягі, Аляксандраўку-1 і 2, Ходараў, Закрупец, Загліннае, Любаны. А вось Прапойск з-за свайго месцаразмяшчэння на высокім беразе на зліцці рэк Сож і Проня і моцнай нямецкай абароны заставаўся непрыступным да 25 лістапада 1943 года. Шлях чырвонаармейцаў да Перамогі быў усыпаны шматлікімі ахвярамі. Кажуць, што нават вада ў Сожы была чырвонай ад крыві.**

**З аператыўнай зводкі Саўінфармбюро за 25 лістапада 1943 года:**

*...Нашы войскі, размешчаныя ў раёне Прапойска, пераправіліся праз рэкі Сож і Проня і пасля кровапралітных баёў прарвалі абарону сапераніка. Немцы мелі на гэтым участку вельмі выгадныя пазіцыі. Яны пабудавалі ўмацаванні, якія прыкрываліся шырокімі воднымі перашкодамі. Савецкія часткі, дзейнічаючы ў цяжкіх умовах лясіста-балоцістай мясцовасці, зламалі супраціўленне сапераніка і авалодалі раённым цэнтрам Магілёўскай вобласці горадам Прапойск, раённымі цэнтрамі Гомельскай вобласці Карма і Журавічы і занялі больш за 180 іншых населеных пунктаў. Праціўнік панёс вялізныя страты. Толькі ў баях за Прапойск знішчана да 2000 гітлераўцаў і захоплены вялікія трафеі...*



## ЯК ПРАПОЙСК СТАЎ СЛАЎГАРАДАМ

Перайменаванне адбылося ў маі 1945 года. Слаўгарадскі пошукавік і стваральнік віртуальнага музея «Спадчына» Аляксандр Халееў прыводзіць у сувязі з гэтым успаміны былога камандуючага 3-й арміі, генерал-лейтэнанта Аляксандра Гарбатава. «...Камандзір 362-й дывізіі, высокі, поўны генерал Васіль Далматаў, добры камандзір і выдатны таварыш, даносячы мне на трэці дзень аб вызваленні вёскі Рудня, паставіў незвычайную ўмову: «Горад Прапойск не ўваходзіць у паласу нашага войска, але мы можам ім авалодаць пры ўмове, што вы не будзеце ўзбуджаць хадайніцтва аб прысваенні дывізіі найменне «Прапойскай». Канешне, я яму гэта абяцаў, і ў трынаццаць гадзін таго ж дня дывізія авалодала горадам Прапойск, а да зыходу дня заняла вёскі Шаламы і Ржаўка».

Аляксандр Халееў — адзін з тых, хто займаецца адраджэннем памяці Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Слаўгарадскага раёна. Ён пошукавік абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру», з 2007 года — намеснік камандзіра слаўгарадскага пошукавага атрада «Спадчына». У 2008 годзе Аляксандр стварыў сайт, прысвечаны гісторыі Слаўгарадчыны, які і носіць назву віртуальны музей «Спадчына» (www.slavgorod-museum.com). У дапамогу тым, хто дагэтуль шукае сваіх родных і блізкіх, якія зніклі на той страшнай вайне, тут карысныя спасылкі і статыстычныя матэрыялы па Вялікай Айчыннай вайне.

## ГІСТОРЫЯ Ў АСОБАХ

Напярэдадні святкавання 80-гадовай даты вызвалення Слаўгарадскага раёна ў горад разам з жонкай, сынам і ўнукам прыязджаў нашчадак чырвонаармейца Васіля Дубадзелава — Віктар Дубадзелаў. Знайсці магілу яму дапамаглі менавіта пошукавікі гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру». **Выкладчык допрызыўнай падрыхтоўкі Магілёўскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа Сяргей ТАГАЕЎ** успамінае, што іх знаёмства з Віктарам пачалося некалькі гадоў таму. Сяргей — ураджэнец суседняга са Слаўгарадскім Чавускага раёна, некалькі дзесяткаў гадоў актыўна займаецца пошукавай работай, у яго адна з найлепшых баз па Чавускім раёне. Па крупінках ён збіраў звесткі яшчэ з тых часоў, калі інтэрнэт замянялі кнігі «Памяць» — друкаваная версія па гісторыі раёнаў, дзе асноўная інфармацыя прысвячалася ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер у гэтым «саіскальнікам» дапамагаюць сайты АБД «Мемарыял» , «Памяць народа» і іншыя. Але імёны такіх пошукавікоў, як Сяргей, — яшчэ адзін дадатковы варыянт знайсці прапаўшага без вестак чырвонаармейца. І Віктар Дубадзелаў нейкім чынам выйшаў менавіта на яго.

— Мужчына шукаў месца пахавання свайго дзядзькі — гвардыі сяржанта Васіля Дубадзелава 1923 года нараджэння, — расказвае пошукавік. — Я знайшоў для яго гэта месца, скінуў каардынаты, і ён прыехаў. Чырвонаармеец Васіль Дубадзелаў памёр 30 сакавіка 1944 года ў 2233-м палявым паходным хірургічным шпіталі і пахаваны на тэрыторыі Слаўгарадскага раёна ў вёсцы Рабінаўка. У баявым данясенні 50-й арміі ён праходзіць як баец другога гвардзейскага асобнага дэсантнага стралковага палка.



Гасцей з Масквы сардэчна прымалі ў Слаўгарадскім райвыканкаме, гісторыка-краязнаўчым музеі, паказалі магілу героя. Аляксандр Халееў асабіста спрабаваў прааналізаваць баявы шлях байца, але пакуль разгадкі, як трапіў дэсантнік на тэрыторыю раёна, няма. «На сайце «Подзвіг народа» баец указаны ў данясенні 50-й арміі без указання вайсковай часці, у якой ён ваяваў перад раненнем. Адзіная згадка пра гэтага чырвонаармейца, што ён памёр менавіта ў Слаўгарадскім раёне», — кажа пошукавік. Па звестках ваенных археолагаў на дадзены момант, дэсантнікаў у Слаўгарадскім і Чавускім раёнах у 1943—1944 годзе не было. І цікаўнасць прымушае шукаць разгадку.

## ПАМЯЦЬ ПРАЗ QR-КОД

Адным з важных мерапрыемстваў сёлетняга святкавання стала ўстаноўка таблічкі з QR-кодам на воінскім пахаванні Героя Савецкага Саюза Вячаслава Чамадурава. Помнік яму знаходзіцца на абочыне дарогі Доўск — Слаўгарад на павароце ў вёску Рудня. Як сведчыць гісторыя, камандзір кулямётнага разліку сяржант Чамадураў вызначыўся 12 кастрычніка 1943 года ў баі за вёску Рудня Прапойскага раёна. За дзень удзельнічаў у адбіцці 19 контратак. У ліку першых уварваўся ў варожыя траншэі і, будучы двойчы паранены, не пакінуў поле бою. Сёння адна з вуліц у горадзе Слаўгарадзе носіць яго імя. Інфармацыйная таблічка на месцы помніка ўстаноўлена дзякуючы патрыятычнай акцыі «Захаваем памяць», якую рэалізоўваюць сумеснымі намаганнямі рэспубліканская арганізацыя «Патрыёты Беларусі» і Федэрацыя прафсаюзаў.

Удзел ва ўрачыстасцях прымалі госці з Ніжагародскай, Бранскай, Смаленскай і Самарскай абласцей. Дарэчы, пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Слаўгарадам і муніцыпалітэтам Стаўрапольскага раёна Самарскай вобласці было падпісана летась. Сёлета гэты раён прадстаўлялі намеснікі кіраўніка па сацыяльных пытаннях Алена Шапілава і па эканоміцы Марына Ганіна.

— Да нас вайна не дайшла, але нашы ўраджэнцы прымалі ўдзел у вызваленні краіны, — падкрэслілі яны. — Наша прамысловасць працавала на поўную магутнасць для фронту. Мы ўражаны тым, як тут захоўваецца памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Мінулае нас моцна звязвае.

## «РАНЕЙ ТУТ УСТАВАЛА ЗЯМЛЯ НА ДЫБЫ, А ЦЯПЕР МАГІЛЬНЫЯ ПЛІТЫ...»

На тэрыторыі раёна 125 воінскіх пахаванняў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. У іх знайшлі апошні прытулак амаль 11 тысяч чырвонаармейцаў. Імёны вядомы крыху болей, чым палова з іх.

— Адна з найбольш вялікіх магіл, дзе пахавана амаль 900 чалавек, знаходзіцца ў гарадскім парку, — удакладняе інфармацыю **экскурсавод Нацыянальнага агенцтва па турызме Кацярына СМІРНОВА.** — У цэнтры Прапойска знаходзілася яўрэйскае гета, дзе было знішчана шмат жыхароў. На грамадзянскіх могілках па вуліцы Чырвонаармейскай ёсць брацкая магіла, дзе пахаваны 223 байцы, якія памерлі ад ваенных ран. А па вуліцы Ракасоўскага, непадалёк ад Слаўгарадскага філіяла «Чырвоны харчавік», устаноўлены помнік 30 мірным жыхарам, якіх расстралялі паліцаі. Імёны 29 з іх вядомыя.

Памяць пра абаронцаў і вызваліцеляў краіны, у тым ліку Слаўгарадскага раёна, увекавечана ў назвах вуліц. Сёлета **старшы навуковы супрацоўнік Слаўгарадскага гісторыка-краязнаўчага музея Вера СТАСЕНКА** правяла даследчую работу па сістэматызацыі звестак аб героях.

— У нас ёсць вуліца Барыса Палявога, Вячаслава Чамадурава, Міхаіла Калініна, — расказвае яна. — Адна з вуліц названа ў гонар камандуючага 50-й арміяй падчас Гомельска-Рэчыцкай аперацыі Івана Болдзіна. Ёсць вуліца імя Канстанціна Ракасоўскага, які камандаваў Беларускім фронтам на той час, ураджэнца Слаўгарадскага раёна франтавіка Кастуся Кірыенкі і іншых. Усяго ў назвах вуліц у нас увекавечана 15 герояў.

У 1981 годзе адначасова паблізу ад вёскі Рабавічы Слаўгарадскага раёна і ў Саратаве былі ўстаноўлены помнікі 19-гадоваму Пятру Панамарову. Ён ураджэнец Саратаўскай вобласці, загінуў пры вызваленні беларускай

